УДК 913

# АСАБЛІВАСЦІ ГІДРАНІМІІ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**І. М. Шаруха**
(Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова",
кафедра прыродазнаўства)

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці гідраніміі Магілёўскай вобласці на падставе аналіза кораней, асноў і фармант гідронімаў.*

Колькасць гідронімаў Магілёўскай вобласці дакладна невядома. На гэта пытанне не адказваюць і 3-хтомавік "Геаграфічна-статыстычны слоўнік Магілёўскай вобласці" (І. Шаруха, 2012–2013), кадастры водных аб'ектаў Пастаянных вадатокаў даўжынёй больш за 1 км – каля 1100, замкнёных вадаёмаў – 636, балот – каля 1650, каналаў – больш за 80, некалькі соцен меліярацыйных канаў. Усяго колькасць гідронімаў можа даць лічбу ў 3700. У працы "Гідранімія Магілёўскай вобласці : этымалагічны слоўнік" ("Магілёўскі мерыдыян", 2019, №№ 1-2, 3-4) намі разгледжана этымалогія 450 гідронімаў (12% агульнай тэарэтычнай колькасці, 100% значных па памерах аб'ектаў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Празрыстую этымалогію маюць гідронімы (назвы каналаў, вадасховішчаў, старарэччаў), назвы якіх паходзяць ад населеных пунктаў, вядомых апелятываў (145 адзінак, 32,2% ад колькасці прааналізаваных гідронімаў).

Усе гідронімы вобласці адлюстроўваюць асаблівасці аб'ектаў, навакольных краявідаў. Найбольш пашыраны наступныя карані (асновы): АВ-/АЎ- старажытнаеўрапейскі, 'вада, рака', Аўчоса; АДА- 'рачны востраў', 'востраў', Адаменка; АЛ-/ОЛ- (10) індаеўрапейскі, Ала, Алешня, Альніца, Альхоўка і інш.; АР- – інда-іранскі, Арыя; АР(Л)-/ОРЛ-/ОР– 'возера', старажытнаеўрапейскі, Арлянка, Орлінскае; БАБ- Баброўка, Бабруйка; БАР-/БЯР-/БР- (8) – 'балота, возера', 'лес, бор', балцкі, або старажытнаеўрапейскі, Бароўка, Бярэзіна, Брожа; БАС-/БЕС– інда-іранскі, можа быць і фіна-вугорскім, Бася; Беседзь, Бясіта; БЕЖ-, Бежыца; БЛ- (7), Белая Натапа, Балонаўка, Благаўка; БОТЧ -, фіна-вугорскі або старажытнаеўрапейскі, Ботча; БУД– германскі, Будагошч, Будлянка; БЫК-/БЫХ- Быкаўка; ВАБ-/БАБ- балцкі або фіна-вугорскі, Вабіч (2); ВАР-, можа быць і балцкі, і фіна-вугорскі, Варонінка; ВАЎ-/ВОЛ- (3) фіна-вугорскі, Ваўчанка, Волчас; ВЕРБ-, Вербаўка; ВІД-, фіна-вугорскі, Відлінка; ВІЛ-, праіндаеўрапейскі, Вілейка, Вільчанка; ВІТ-, – 'вада', Вітава; ВІХ-/ВЕХ-, інда-іранскі, можа быць і фіна-вугорскім, Віхра; ВІШ- старажытнаеўрапейскі, Вішанка; ВУД-, Вудага; ВЯД-, 'вада', Вядзерка; ВЯХ–, 'старая вада', 'старык', Вяхава; ГАЛ-/ГОЛ- (5), Галуба; ГАНЧ- Ганчанка, Ганчанскае Балота; ГАР-/ГОР- (6), Гарадзечанка, Горанка; ГД- 'балота', фіна-вугорскі 'возера-разліў', Выгада; ГІЖ – Гіжэнка; ГЛ-/ГІЛ-, балцкі 'глыбіня', Глінец; ГН- (3), 'лужына, балота', Гнілка; ГОРЛ- (3), 'пратока'; ГР- (3), Грава, Грэза; ГУС-/ГУЦ-, Гуцянка; ДАБ-/ДОБ- (4), балцкі, Дабасна; ДАБР-/ДУБР (3), інда-іранскія, Дабранка, Дубравенка; ДАМ-/ДМ-, 'ціхае балота', Адаменка, Дамалка; ДАР-, Даранка; ДАС-, Даска; ДЗВ-, Продзвінка; ДЗЕБ-, старажытны індаеўрапейскі, Дзебра; ДЗЕР(Б)-, 'возера', Дзерна; ДЗЯГ – 'балота, багна', Дзягаўка, Дзягцярка; ДЗЯР-, фіна-вугорскі, Дзяражня; ДМ- – 'ціхае балота', Домса; ДН-(8), найстаражытнейшы агульнаіндаеўрапейскі або праіндаеўрапейскі, Дняпро, Дняпрэц; Дунаёк; ДОЛ- – 'дол, нізіна, яр', Даўжанка; ДР-/ДРАГ-, кельцкія, Друць, Драгічын; ДУЛЕБ-(4), германскі, Дулебы; ЕЗ-, старажытны, або германскі, Езва; ЕЛ- (6), фіна-вугорскі, Елавец, Ельня, Ялец; ЕС-/ЭС – старажытнаеўрапейскі, Ясенка; ЖАД-, фіна-вугоркі, Жадунь; ЖВ-/ЖЛ-(4) Жавуніца, Жовін, Жылеўка; ЖЫЦ-, фіна-вугорскі, Жыцінка; ЗАБ-/ЖАБ-, Забава; ЗУБ-/ШУВ- – 'вада, рака', Зубар; ІЗБ-/УЗБ-, германскія, Узбінка, Ізбінка; ІП- інда-іранскі, Іпуць; КАЗ-/КАС- (3), балцкі, Казёл; КАЛ-, Каўпіта; КАМ-, Камарынка; КАП-, Капуснік, Капчанка; КАТ-, Покаць; КАЧ – Качарага; КАШ-, Кашанка; КЕЧ-, Кечкаўка; КЛ-(6), 'балотнае возера, балотны паток, струмень', Даколька, Клява; КЛ-/ХЛ-, Ухлясць; КОП-, Копылка; КОР-, Кормна; КОС-/КОШ-, Космынь; КР- (4), старажытнаеўрапейскі, Крупка; КРАС-, балцкі, Красная; КУЛ-, Кулажанка, Кульшыцкае; КУР-, Куракоўка; ЛАБ-/ЛАВ-, Лабжанка, Лавішча, Лавы; ЛАГ-/ЛУЖ-, Палуж; ЛАЗ-/ЛАС- – 'возера, заліў, бухта', 'нізіна', Лазнёўка, Ласінка; ЛАХ-, германскі, Лахва, Лахвіца; ЛЕБЯД–, Лебядзёўка; ЛЕН- Лена; ЛЕШ-, Лешня, Лешча; ЛІМ-, Лімна, Лімнічанка; ЛІС-, Ліса; ЛОБ-/ЛАБ-, Лобжа, Лобчанка; ЛОЖ, ЛОШ-, Яложынскае, Лоша; ЛУБ- Лубянскі; ЛУЖ-/ЛУГ-, Чыстая Лужа; ЛЮБ-, Любуж; ЛЯД-, Лядзешня, Лядня; МАГІЛ-, руч. Магіленя; МАЛ-(4), 'мох', 'бераг', Маластоўка, Малыш; МАС-/МАХ-/МЕС-/МЕШ- (5), 'махавое балота', Маславічы, Месенка; МІЛ-, Мілаўка; МУР-, Мурашка; МЯР-(3), Мяртвіца, Мярэя; НЕГ-/НЕЖ-, Няжэўля; НЕР-/НЯР-, Няропля (2); НЯС-/НЕС-, Нясета; ПАК-/ПАГ-, Запакулка; ПЛ-(3), Паўна, Плешчыцы, Плясна; ПАЦ-/ПАС-, Пацэя; ПН- р. Пнёўка; ПР-/ПЕРА- (10), старажытнаеўрапейскі; ПЦ- /ПС- /ПЕТ-, Пціч; РАС-, Расамаха, Раста, Парасіца; РД-/РДЗ-, Рдзіца, Рудзея; РУХВ-/АХВ-, падобна на германскі, Рухва; РЦ-/-РД-, Арціслаўка; РЭК- (6), кельцкі або старажытны індаеўрапейскі, Рэкта; САБ-/САВ-, Сабалеўка, Сава; САК-/СОК-, Сакалец; САС-/ШОШ-, фіна-вугорскі, Сасновіца, Сож; СВ- (8), старажытнаеўрапейскі, Свінка, Свіслач, Святое (6); СЕ(І)Н-/СЯН- (6), Сенкаў, Сінька, Сіняя; СЕР-, Серабранка (2); СІТ-, Сітня; СЛ-/СЕЛ-/СЛ- /СОЛ- Аслік, Асліўка, Ослік; СМ -, Смерд, Смуродзіна, Самаволка; СТР- (10), старажытнаеўрапейскі, Кастрычка, Астра, Струг; СУБ-/СУВ-, фіна-вугорскі, Суботка; СУР-/ШУР-, фіна-вугорскі, Суравец, Сураў; СУШ-(2), фіна-вугорскі; ТОЧ-, кельцкія, Точанка; ТР-(10), балцкі або фіна-вугорскі, Трасна, Трасцянка, Трэсціўка; ТУР-, старажытнаеўрапейскі, Тур'я, Турчанка; УЛ- (2), старажытнаеўрапейскі, Ульянка; ХМ-, 'махавое балота', Хмялінка; ХОЙ-/ФОЙ-(3), Фойна; ХОЦ-, германскі, Хоцінка, Хоцішча; ЧАР-, Чарабамірка; ЧАРН-/ЧОРН-/ЧЭРН- (15), старажытнаеўрапейскі, Чарнаводка, Чарніца, Чорная; ЯРВ-(2), фіна-вугорскі.

Але вызначаюць паходжанне гідроніма не карані, а галоўным чынам фарманты: *-а* – 'рака' (19 назваў/4,2%; Ала, Вейна, Зубра, Ольса, Суша); *ава-(ахв-)* – уплыў кельтаў: Забава, Клява, Рухва; *-ае* (-нае, -авае, -інае)/-ое (10/2,2%, Бярозавае, Крывое, Святое); *-анка* (25 /5,6%; Альшанка, Серабранка); *-ар* (Зубар), *-ас* – балцкі (Волчас), *-аў* (Прусаў, Сенкаў, Сураў); *-аха /ахва* – германскі (Расамаха, Лахва), *-ая* – старажытны (8 /1,8%; Белая, Крывая, Чорная); *-ва* (Езва, Мертва, Радомльва); *-га* – 'рака' (Вудага, Качарага); *-гошч* (Будагошч, Мірагошч); *-енка/-енкі-/-інка* (6); *-ень* – гоцкі (Цімень, Сплавень); *-еня* (Магіленя); *-ёр -/-ер* ад *-ерк* – эрзянскага ЭРЬКЕ – 'возерв' (Асцёр, Успер); *-ец/-эц* – "дунайскі" фармант, у германскіх гідронімаў *-ац* (10/2,2%; Глінец, Дняпрэц, Елавец, Суравец, Чачавец); *-ік* (Капуснік, Ослік); *-ін(-*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*ын)*– кельцкі (Драгічын, Жовін); *-іна/-іно/-ына* –венедскі (каля 2%; Бярэзіна, Галубіна, Смуродзіна); *-інка/-ынка* – валынцаўскі (2,2%; Вепрынка, Жыцінка, Ізбінка, Чыгірынка); *-іта* – балцкі (Бясіта, Каўпіта); *-іца /-ыца/-іцы* – "пражскі" ('рака'; 4,2%; Альніца, Бежыца, Жавуніца, Мяртвіца, Ольніца, Парасіца, Чарніца); *-іч* (Вабіч, Бабіч, Пціч); *-ічы* – "дулебскі", "драгавіцкі" (Маславічы); *-аўка/-ёўка/-оўка/-яўка* (38/8,5%); *-ка* - "валынцаўскі" і іранскі; *-кі* – "валынцаўскі" (75 /16,7%; Асліўка, Бабруйка, Вілейка, Дунайка, Язвітка); *-ля* – балцкі (5/ 1,1%; Грэбля, Касуля, Няропля); *-на/-ня* –старажытнарускі (24/5,3%); *-о* Дняпро; *-ок/-ёк* – зараз успрымаецца як характарыстыка незначнасці даўжыні, у ранейшым часе – 'ручай, рака' (каля 1%; Гарадок, Дунаёк), *-оль* (Цераболь); *-са* (Домса, Аўчоса); *-скае /–ская/-скі/-скія/-ское/-цкі/-цкая* - славянскія (каля 5%; Ганчанскае, Горлаўскі, Дулебскае, Кульшыцкае, Лочынскі, Яложынскае); *-та* (1,6%; Раста, Рышта, Рэкта); *-ун* – балцка-кельцкі (Плывун); *-унь* – гоцкі (Жадунь); *-уша* (Малуша); *-уць* –часцей інда-іранскі, радзей балцкі (Друць, Іпуць); *За- + це -* – германізм (Зарэсце); *-ць* – інда-іранскі (Покаць); *-ч* – старажытнаеўрапейскі і балцкі (Свіслач); *-ча* (Ботча, Зарудзеча); *-ша* (Галыша); *-шча, -шчы* – славянскія (Лавішча, Палазёрышча, Хоцішча); *-ы "дунайскі"* (каля 1%; Дулебы, Волы, Лубяны); *-ынь* – германскі (Космынь); *-ыя*– інда-іранскі (Арыя); *-эя* – фіна-вугорскі (каля 1%; Мярэя, Пацэя, Рудзея, Турэя); *-янка* – у большасці выпадкаў – дэмінутыўны, але можа быць і фіна-вугорскім фармантам, ад –янк – 'балота', вільготная катлавіна, лагчына (3,3%; Арлянка, Будлянка, Гуцянка, Ульянка); *-я* – сустракаюцца і ў інда-іранскіх і фіна-вугорскіх назвах (Бася, Проня); *-яе* (Сіняе), *-яя* (Сіняя), *-'я* – балцкі (Тур'я).

Гідранімічнае поле вобласці вельмі стракатае: гідронімы старажытнаеўрапейскія, інда-іранскія пераплецены з балцкімі і фіна-вугорскімі, значная колькасць назваў славянскія і трансфармаваны імі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова